ПАГОНЯ

Адрэс рэдакцыі і канторы:
Вуліца Адама Міцкевіча, 13-а.
Тэлефон № 23.

Рэдакцыя адчынена што дзень ад 1—2 гадз.
Кантора адчынена што дзень ад 8—3 гадз.

ГРАМАДЗКАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ І ЛІТЭРАТУРНАЯ ЧАСОПІСЬ.

ВЫХОДЗІЦЬ ЧАСОВА РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Падпіска каштуе:
на 10 № № уперад — 10 зал.
„ 5 „ „ — 5 „
Кошт асобнага № — 1 „

Рукапісы не прыняты да друку назад не вертаюцца; прынятыя аплачваюцца па пагляду Рэдакцыі.

Абвесткі ўселякага разьмеру прыймаюцца коштам за радок маленькага друку 2 залаты на опошняй страніцы незалежна ад зьместу.

№ 4. | **Коўна, Чацьверг, 19 жніўня 1920 году.** | **Год І-шы.**

Коўна, 18 жніўня.

Зямля з'яўляецца багацьцем чалавека і не можэ быць прэдметам спэкуляцыі; яна мусіць належыць да таго, хто на ей працуе. Зямельная рэформа ва усіх Гаспадарствах праводзіцца розна—залежна ад таго, які характэр мае само Гаспадарства. Калі мы возьмем бальшэвікоў, то мы ўбачым, што яны у сваей тэорії так сама згодны з тым, што зямля павінна належыць да працоўнага народу, але паглядзём, як яны на практыцэ праводзяць сваю тэорію. Бальшэвікі забаранілі дзяліць маентнасьці і ўладаць імі на правох ўласнасьці. У іх ўся зямля супольная і таксама супольны інвэнтар і абработываць зямлю павінны выхадзіць ўсе супольна. Ў Літве прабавалі таксама ў некаторых мейсцах рабіць тое самае, толькі нічога з гэтага ня выйшла. Дык і у бальшэвікоў, як бачым, нічога добрага з гэтага ня выходзіць: адзін другога абкрадаюць, жывёла, інвэнтар, земляробныя спрonты гібнуць, ніхто ня можэ рабіць рэмонту, ні будынкаў, ні хат, ніхто ня хочэ апахаваць як трэба зямлю, таму і ураджаеў німа, а людзі гінуць з голаду. Сусім другое, калі чалавек мае свой ўласный кусок зямлі: распараджаецца як хочэ, засевае што яму патрэба, будуе сабе хату дзе захочэ, сам сабе гаспадар, а як памрэ, то ёсьць што і дзяцём кінуць. Літоўскі Сойм ужо шмат разьдзяліў маенткаў. Ён выдаў некалькі законаў аб зямле. Па гэтым законам арэндатары і дворскія работнікі застаюцца пры маёнтках. Салдатам Літоўскай Арміі, якія праслужылі адзін год у войску, ужо Сойм разьдзяліў некалькі тысячаў калёній па 10—20 дзесяцін. Кожны год ў Літве разьмяжовываецца каля 100.000 дзесяцін, па 10—20 дзесяцін ў куску для раздачы беззямельным і малазямельным. Праз некалькі гадоў быць можэ дойдзе да таго, што ўсе будуць ўжо надзелены зямлей і тады ні вялікаўласьнікаў, ні памешчыкаў ня будзе, а ўсе будуць праўдзівыя хлебаробы літоўскай зямлі.

Ўсе лясы переходзяць у рукі Ураду і тады людзі будуць ляпей абслужаны лясным матэрыялам. Возеры так сама пераходзяць Казьне і толькі крэсьцьянскія лясы і воды аетаюцца пры іх.

З гэтага ўсяго відаць, што літоўская зямельная рэформа, разьдзяліўшая паміж працоўнага народу землі на правох ўласнасьці, куды лепшая ад бальшэвіцкага закону ўладаньне зямлёй на камуністычных пачатках.

У палякоў зямельная рэформа праводзіцца сусім па другому. Польскі Сойм ў Варшаве пастанавіў разьдзяліць маентнасьці, але як. Памешчыку аставіў на душу па 200 дзесяцін (180 гэктароў), астальковыя землі крэсьцьяне выкупаюць па вельмі дарагой цане. Гавоpуць, што хтосьці запрапанаваў браць за морг (1/2 дзесяціны) з мужыкоў па 1000 залатых польскіх, а прэмьер-Міністэр Падэрэўскі дапісаў толькі адно слова „золатам“. Калі гэта толькі жарт, то трэба казаць, што гэта добры жарт! Праўда у тым, што за 1 1/2 гада польскай акупацыі мужыкі зямлі не атрымалі.

Так як памешчыкі зямлю сваю у большай часьці не зарабілі сваей працай, а дасталася яна ім спадковым чынам, або пры помачы спэкуляцыі, так як яны, уцёкшы ў Расею ад немцаў ў часе вайны, былі царскім Урадам яшчэ добра за ўсе шкоды адшкадаваны, так як яны атрыманыя за адшкадаваньня грошы ня выдадуць на карысьць Літоўскага Гаспадарства, або на карысьць мужыкоў і так як мы бачым, што многа маёнткаў ляжыць адлогам непаханымі бяз ніякай нікому пользы, то справядлівасьць вымагае, каб гэтыя маёнткі Літоўскі Урад забраў бяз выкупу для разьдзелу праўдзівым зямляробам. Літоўскі Сойм ужо лес нацыяналізіраваў. Так сама адабраў часьць маёнткаў (скарбовыя, царскія, дараваныя каралямі і царамі) і ўжо дзеліць малазямельным і беззямельным, а у першы чарод жаўнерам Літоўскай арміі. Так сама Літоўскі Урад прыступіць да разьдзелу маёнткаў і той часьці тэрыторыі, якая знайходзілася пад польскай акупацыяй і таксама малазямельныя і беззямельныя беларусы будуць надзелены зямлей. Толькі трэба адно памятаваць, што разьдзел зямлі—гэта праца некалькіх гадоў. У адзін дзень гэтага зрабіць ня можна. Трэба маентнасьці пераняць, разьмяжаваць, разьдзяліць, выбраць каму даць і колькі кожнаму даць. Усё гэта трэба абмазгаваць ў камісыях і ўжо тады аддаць новаму ўласьніку, каб... добра і крэпка аддаць.

◆◆◆◆◆◆

Дэклярацыя
Старшыні міністроу Д-ра ГРЫНЮСЯ,

(Працяг).

Ўрад змушаны будзе йсьці шляхам старацельна прыгатоўленай праграмы экспорту і імпорту. Гэта будуць таксама першыя крокі для заключэньня трактатаў з іншымі дзяржавамі на засадах каапэрацыі.

У сфэрэ прамыслу, Ўрад будзе трымацца засады запэўненьня можнасьці як найшырэйшага разьвіцьця ініцыацівы прыватнай і каапэратыўнай, рэгулюючы яе і пабуджаючы праз адпаведные уставы. Ўстаў аб упраўленьні і стварэньню акцыянерных хаўрусоў будзе адным з першых.

У распачатку гаспадаркі грашовай Ўрад будзе трымацца засады, каб бюджэт, чы устаў, якія прэдуглежываюць і дазваляюць выдаткі і даходы, былі-б аднолькавы і агульны. Апрыч таго, Ўрад у найбліжэйшым часе аддасьць у Сойм праэкт аб забязпецэ ад агню.

Будзе узяты пад увагу найстараннейшы расклад падаткаў бэзпасрэдніх і прыведзеньне у парадак—пасрэдніх і манаполі. Адно з найгоршых, што засталося ад вайны, гэта нямецкія банкноты. Эмісыя у часе акупацыі ачывіста не апералася на такіх гварантыях, якія-б адпаведалі патрэбам нашага краю. Залежым цяпер ад краю, які пусьціў у абварот банкноты ня толькі у отрасьль гандлю. Усякае палітычнае ваганьне у Нямеччыне зараз жэ знайдзе адгалосак у грашовым палажэньню Літвы. Загадненьня эмісыі састаўляе надта хуткае заданьне ня толькі у мэці звальненьня рынку ўнутрэнаго ад бэзпрацэнтавай пазыкі, але і з пагляду незалежнасьці грашовай, гандлевай і эканамічнай. У отрасьлі камунікацыі Ўрад будзе вясьці гаспадарку чыгунак, тэлефонаў, телеграфаў, бяручы за падставу засады эканамічныя, а не палітычныя і таму будзе старацца зьменшыць выдаткі і павялічыць даходы. Ўрад добрэ прэдвідзе тыя труднасьці, якія трэба будзе пераламіць, іменна, у сфэре эксплаатацыі чыгункі, бо ў часе войны, ані чыгунка, ані станцыі не папраўляліся, а толькі псаваліся. Апрыч таго, сюды далучаецца крызыс сусьветнае вайны, ге гаворучы ужо аб павялічаньні нормы вознараджэньня работнікаў.

Урад зьвярне увагу на будаўніцтва шляхоў і мастоў коштам Дзяржавы і самаупрауленьняў. Літва ня толькі дзяржава дэмакратычная, але і край права. Ўрад будзе старацца, каб ўсе урадоўцы станоуча трымаліся права і праўнасьці.

Уся праца Ураду і урадоўцаў павінна апірацца на уставах. Аднача ня ўсе абавязываючыя у нашай Дзяржавы уставы згаджаюцца з патрэбамі жыцьця, ня усе запэўняюць абвешчэныя у Тымчасовай канстытуцыі вольнасьці. Але ў гэтых часах якая колькек галіна краевага жыцьця ня можэ позастацца незнармаванай праз уставы. Тымчасова, аднача, рукаводзючыся старымі уставамі, Урад будзе старацца аб прыгатоўцэ праэктоў уставоў, якія маюць найлепі адпаведаць вымаганьням жыцьця і будуць служыць развіцьцю абвешчаных у Тымчасовай Констытуцыі вольнасьцяў. Апрыч таго Урад катэгарычна зазначае, што з свабод грамадзянскіх карыстаюцца толькі тыя, хто не выступае процiў нашай Дзяржавы і процiў яе незалежнасьці. Узглендна руйнуючых Дзяржаву здрайцаў будуць застасованы ня вольнасьці, але карацельные ўставы. Нашы ўставы даюць самоўпраўленьням дужа шырокія правы, адначасова накладаючы на іх не мала і абавязкоў. Малодзенькім нашым самоўпраўленьням бракуе яшчэ выпраўных працоўнікоў. Тут заданьнем Ураду будзе пастарацца аб добрых знаўцах працы перш для цэнтру, а пасьля і на мейсцах.

Апрыч таго, Ўрад пастараецца аб праэкце уставу зфінансаваньня самаўпраўленьняў, бо бэз такога уставу ў самоўпраўленьньях ня можэ йсьці нармальная праца. Наша пасьпешна з'арганізаваная міліцыя ня досьць прыгатоўлена, да выкананьня даручаных ей функцыяў. Не адкладаючы ані на хвілю справы, Урад возьміцца за арганізацыю міліцыі, каб яна стала адпаведным ворганам дзеля ахраны ўстаноўленага ўставамі парадку. Літва—край работнічы. Нашы уставы павінны ня толькі нармаваць варункі працы, але і забязпечыць работнікам зносные варункі ў разе хваробы і ў часе старасьці.

І тута-ка Ўрад будьзе старацца аб прыгатаваньні адпаведных уставаў і па іх абвешчэньню аб прыстасаваньню да жыцьця:

Статыстыка выказвае, што ў працягу астатніх годаў ў цэлай Літве больш памерае, чым родзіцца. Ўрад прэдпрыйме ўсе мажлівые сьродкі ў змаганьню сьмяротнасьці.

Незалежнасьць Дзяржавы можэ быць для нас загварантавана толькі маючы моцнае з,арганізаванае гатовае да яе абароны войска, сярод якого патрэбны пільныя рэформы і удасканаленьня маючыхся форм, каб у гэты спосаб армія засталася зьлітай у адно цэлае.

Карнасьць, гэта праўдзівая падстава моцы кожнай арміі, павінна быць пастаўлена на найвышэйшую ступеню; выпраўка павінна быць завідная, афіцэры павінны старацца таксама і аб агульнай ступені культуры жаўнера; начальнікі павінны быць добра выдасканалены ў сваей спэцыяльнасьці.

Ўрад, паскольки хваце сьродкоў, даложэ стараньня, каб жаўнер—абаронец краю, меў належны харч, каб яго сямья атрымывала дапамогі, і каб ён і сам, калі страціць, у часе вайсковай службы, здароўе, чы пасля выслугі адпаведнай лічбы гадоу, атрамаў бы эмэрытуру; ня мінучым есьць устаноўденьне часу адбываньня вайсковай службы, упарадкаваньне мабілізацыі і набору.

Але слаўнае ймя абаронца незалежнай Літвы жаўнеры могуць насіць толькі тады, калі яны сьцісла выпаўнялі вайсковыя уставы, статуты і загады, ня шукаючы якіх небудзь пабочных выясьненьняў і шляхоў. Для гэтага таксама ад кожнаго начальн ка ў войску катэгарычна будзе жадана. каб ня толькі ён, але й яго пад'уладные сумленна выпаўнялі свае абавязкі, маючы мэтай толькі патрэбу абароны Бацькаўшчыны, благапалучча народу і усьпех службы.

Падставай гаспадаркі ў Літве ёсьць ў першым раду землябробства і лясы.

Ня меньшае мае значэньне у гэты пераходны мамэнт і т. зв. „Рэформа аграрная“, якая паважна датычыць парадкаваньня спосабаў уладаньня зямлёй. Цяпер гэта пытаньне ёсьць, навэт, важнейшае і ім бардзей зацікаўлена грамадзянства, чым пытаньнем землябробнай гаспадаркі. Праводзючы аграрную рэформу забязпека зямлёй беззямельных і малазямельных павінна быць пастаўлена на першае мейсца. Разглядаючы гэтыя пытаньня, як падставу, бярэцца ў аснову дробны стан ўладаньня зямлей, гарманіруючы з засадай працы; трэба тут ўзяць пад увагу і прадуктыўнасьць працы і каб рэзультаты працы адпаведна дасталіся таму, хто працуе.

Праводзючы гэту рэформу, мы не павінны забываць, што яна павінна быць у гармоні з патрэбамі краю і засадамі людзкасьці.

(Працяг будзе).

◆◆◆◆◆◆

Правы Членаў Установчага Сойму.

1) Члена Установчага Сойму не датычэ усіленая абарона, ваеннае чы асаднае палажэньне і іншыя свабоды грамадзян сьцесьняючыя прыказы і пастанаўленьня. 2) Член Установчага Сойму можэ пасешчаць ўсе урадовыя установы і самаўпраўленьня дзеля абзнаёмленьня з парадкам іх працы і вымагаць ведамак ад гэтых установ. 3) Члена Установчага Сойму ня можна падвергаць сьледзтву і цягнуць да адпаведнасьці з поваду зданьняў, высказаных ім у Установчым Сойме, выпаўняючы абавязкі члена Установчага Сойму.

◆◆◆◆◆◆

Міністры Літвы:

Міністер Грашовых спраў, Гандлю і Прамыслу і тымчасова спаўняючы абавязкі Міністра Шляхоў, Эрнэст Гальваноўскі — радзіўся ў 1882 г. ў Вагальнецкай парафіі, ў Біржанскім вокругу (быўш. Панявескі павет). У 1902 г. скончыў Мітаўскае рэяльнае вучылішчэ і, здаўшы канкурсовыя экзамены, паступіў ў Горны Інстытут у Пецярбурзе. У 1905 г. участваваў ў рэвалюцыі, агітуючы найболей у Панявескім павеце і керуючы селянскім рухам у гэтым-ж павеце. Прынятыя праз Панявескіх селян рэзалюцыі былі фундамэнтам Хаўрусу Селянскага, які стварыўся ў Вільні, ў часе Вялікага Сойму у Вільні; Э. Г., які прыймау учасьця ў тым Сойме, быў адным з першых ініцыатараў і тварцоў Хаўрусу Селянскага. Ў часе ўмацаваньня рэакцыі, у пачатку 1906 г., Э. Г., быў арэштаваны і пасажэны ў Панявескую турму, адкуль праз тры месяцы быў звольнены на парукі да суду. Дзеля таго, што кандыдатура яго была выстаўлена да 2 Думы, пад націскам паноў і паліцыі, Міністэрства Справядлівасьці дала распараджэньне Пракурору ўзноў яго арэштаваць і пратрымаць да канцу выбарау. Сябры Э. Гальваноўскага—У. Сруга, К. Матуліс і П. Жыткевічус былі присуджаны ад 3 ад 6 гадоў катаргі. Гальваноўскаму удалося выехаць з Пецябургу ў Фінляндзію і там жыць пад назьвіскам сваей маткі Жукоўскай. Жывучы у Фінлядзіі ад 1906 да 1908 г., апрыч сваей спэцыяльнай працы, займауся карэспандэнцыей і пісаў брашуры пад рожнымі псэўдонімамі.

Калі у Фінляндзіі пачаліся арэштаваньня, Э. Г. выехаў у Бэльгію, дзе паступіў у Унівэрсітэт у Льежы, які і скончыў, як інжэнэр гарняк і электратэхнік. У працягаў 1913 году працаваў у Бэрліне як інжэнэр. У канцы тагож году быў запрошан у Сэрбію, ў горны Дэпартамэнт, але прыехаўшы ў Белград, паступіў ў Францускі Кансорцыум некалькіх банкаў, якія давалі пазыку ураду сэрбскаму і якія атрымалі за гэта значную канцэсію на будоўлю чыгункі, разработку лясоў і іншыя грамадзянскія работы. Вайна засьпела Э. Гальванаўскага у Белградзе, дзе ён пазастаў, як прэдстаунік гэтай кампаніі ў часе вайны. У часе, калі Сэрбія была занята Аўстрыяй і Балгарыяй, Гальваноўскі быў змушаны выехаць з войскам сэрбскім праз Альбанію і Чэрнагорыю.

Гэты адварот адбываўся ў працягу 3 месяцаў ў надта цяжкіх варунках. З усяго войска сэрбскага (каля 300.000) жывых засталася толькі каля 75.000, шмат вынішчыў голад і хваробы. Пад канец падарожжа, у Скутары, захварэў Э. Г. тыфусам і, толькі дзякуючы старэньням прэдстаунікаў францускага і італьлянскага, быў выратаван іп рывезян у Францію, ў пачатку 1916 годў, астатнім параходам Чырвонага Крыжа. Ў часе працы ў Парыжу, як інжэнэр, быў выбраны ад Ураду Літвы членам літоўскай дэлегацыі мірнай канфэрэнцыі ў Парыжу.

Вярнуўшыся з сацыялістычнай канфэрэнцыі ў Люцэрні, прыехаў ў Літву, дзе яму было даручэна злажэньне новага Габінэту, па выхадзе ў дымісыю коаліцыоннага Габінэту.

◆◆◆◆◆◆

Ваенна-палітычны абгляд

За тыдзень.

Мірныя пераговоры між Савецкай Расеяй ' Фінляндыяй, узноўленыя 27 ліпеня г. г. у Юр'еве трывалі толькі некулькі дзён.

У Эстоніі—у Рэвелі мела мяйсцо бальшэвіцкае паўстаньне; дэманстранты пачалі штурмаваць Установчы Сойм, пасьля акружылі памешканьне Міністэрства Унутраных Спраў, патрабуючы асвабаджэньня арэштаваных бальшавікоў.

Латвія і Савецкая Расея ўрэшце, пасьля доўгіх перагавораў 12-га жніўня г.г. падпісалі мірную ўмову. Падпісаньне мірнай умовы ў даны мамэнт, дужа на руку для Латвіі, бо ў апошнія часы Савецкая Расея выбрала (прыпадабала) сабе Латвію, як аб'ект, скуль бязупынна савецкімі агентамі арганізаваліся шпіонскія апараты ў суседніх гаспадарствах. Латвійскія ўласьці, разам панекуль з аддзелам унутранай контр-разьведкі прымаюць энэргічныя меры дзеля ліквідацыі бальшавіцкіх арганізацый.

Канфэрэнцыя балтыцкіх гаспадарстваў у Більдэрлінгсгофе з'яўляецца бэзпасрэдственным прадаўжэньнем Гэльсінгфоргскай канфэрэнцыі, праграма якой складалася з 4-х частак: палітычнай, ваеннай, эканамічнай і нацыянальнай.

Адносіны паміж Нямеччынай і Латвіяй урэшце зусём урэгуліраваны падпісаньнем 15-га ліпеня г.г. прадстаўнікамі абоіх гаспадарстваў „Часовае умовы“ аб узнаўленьні зносін між Нямеччынай і Латвіяй і ратыфікацыяй гэтай умовы Нямецкім Соймам (рэйхстагам) 2 жніўня г.г.

Францыя, праяўляючая у апошныя часы асобую цікавасьць да балтыцкіх гаспадарстваў і стараючаяся прывясьці да зблізкэньня Латвію, Эстонію і Літву з мэтай прыцягненьня іх да цеснай зьвязі з Францыяй—назначыла Галоўным Камісарам для балтыцкіх гаспадарстваў п. дэ-Сартіж.

Адносіны між Літвой і Савецкай Расеяй, не зважаючы на падпісаны мір, з прыходам чырвонай арміі ў Вільню і ўступленьнем яе на літоўскую дзяржаўную тэрыторыю, абвострыліся. Бліжэйшай прычынай і повадам паслужылі прысутнасьць і дзейнасьць у Вільні Ваенай Рэвалюцыйнай рады на чале з літоўскім камуністам Алекса-Ангарэцісам. У презыдыуме Віленскага „рэвкома“ знаходзіцца 2-х палякоў — Муклелвіч і Ціхоўскі. З тае прычыны, што прысутнасьць гэтых камуністычных арганізацыяў, прыймаючы від і функцыі Ураду Літвы, саздалося пры рэальным і маральным падтрыманьню камандаваньня чырвонай арміяй і прадстаўляло сабой прыклад (страшэннага) нарушэньня 4-га пункту мірнай умовы, то Літоўскае Міністэрства Замежных Спраў прадставіла па гэтаму поваду энэргічны пратэст. У меце адстараненьня нарушэньня ў прышласьці Літоўскага Дзяржаўнага сувэрынітэта, Савецкі Урад загадаў камандаваньню чырвонай арміі устрымілівацца ад умяшацельства у ўнутраныя справы Літвы, а таксама ад увядзеньня савецкіх парадкоў у занятых вакругох Літвы. Па пытаньню аб эвакуацыі Літоўскай тэрыторыі чырвоным войскам дойдзена да згоды, пры гэтым самая эвакуацыя Літвы павінна быць праведзена ў 3 разы. Тэрыторыя першага эвакуацыйнага перыаду, абхватываючая вокруг Нова-Сьвянцян ужо перэдана ліцьвінем 12 жніўня г.г Абшар другога эвакуацыйнага перыаду абхопліваючы Вільню, павінен быць ачышчан бальшавікамі да 1-га верасьня, г. г. Ачышэньне абшару 3-га эвакуацыйнага перыаду, абхопліваючага район Гораднi будзе залежыць ад стратэгічных саабражэньняў.

На польска-бальшавіцкім фронце ваенныя чыннасьці, не зважаючы на гатовасьць Польскага Ураду на пераміріе і мір з бальшавікамі, не перарваліся. Чырвоная армія прадаўжае энэргічнае наступленьне і ў гэты мамэнт займае лінію: Млава-Цэханоў-Макоў, - Пултуск - Вэнграў - Седлец - Лукоў-Влодава-Холм-Грубешоў-Радзівілоў-Бучач. Варункі, якія Савецкая Расея хоча правясьці ў угодках аб перамырыі і міры, вось гэтыя: 1) Зьменшаньне польскай арміі да 50.000 штыхоў, 2) Зачыненьне ўсіх польскіх фабрык ваенных матэрыялаў, 3) Граніцы Польшчы будуць адпавядаць граніцам, азначаным Вярхоўнай Радай, папраўленым аднак у пунктах Беласток і Холм, 4) Свабода гандлёвых зносін з Усходняй Прусыяй цераз Беласток і Граева.

На паўдзённым фронце — на Украіне — Віньніьэнка ўзноў усплыў на паверх, дзе ен становча прыняў савецкую арыентацыю і вядзе энэргічную палітычную работу ў гэтым напрамку.

У Крыме, на фронце арміі гэн. Врангеля ваенная палажэньне ў даны час трэба прызнаць зусім устойчывым. Топографія мяйсцовасьці, займаемай Врангелям—гэтакая, што бальшавікам, пры усім іхным уменьні вясьці грамадзянскую вайну, ніколі ня ўдасца аканчацельна ліквідаваць армію, варта сказаць, цяпер пераіменованую з самаахвотніцкай у народную. Перамагчы і ліквідаваць Врангеля будзе таксама цяжка, як у свой час цяжка было ліквідаваць казацкую „Сеч“.

Фронт гэн. Врангеля пасьля утраты бальшавікамі Таганрога, Растова Кацярынадара і Новарасійска — пры помачы ўнутраных паўстаньняў, заходзіць левым крылом у Кацярынаслаўскую губ., дзе апэрыруюць паўстанскія часьці Махно, а правым канчаецца на Кубані. У палітычных адносінах палажэньне арміі і Ураду гэн. Врангеля, значна умацовалося дзеля прызнаньня Францыяй Габінэту Врангеля,—Урадам Паўдзённай Расеі. Х. Ш.

◆◆◆◆◆◆

Весткі Гэнэральнага Штабу.

10. 8. 1920.

На поўдні нашы часткі ўзайшлі на перадавую лінью Аўгустова. Пасьля уходу рускіх наша войска заняла Сьвенцянскі раен. У другіх напрамках бяз перамен.

Ген.-Лейт. КАТХЭ.

◆◆◆◆◆◆

Адозьвы з фронту.

1) У Рэдакцыю „Пагоня“.

Атрымаўшы Ваш № 1, **беларусы - вайсковыя** з фронту пасылаюць сэрдэчны прывет. Нехай жыве братэрскі хаўрус літвіноў з беларусамі!

2) У Рэдакцыю „Пагоня“.

Культурна-Асьветны Аддзел №... роты і Рэдакцыйная Рада беларускай вайсковай часопісі літоўскага войску „Варта Бацькаўшчыны“ (Tėvyne Sargyba) шлюць гарачы прывет даўно чэканаму сабрату і жадаюць хутчэйшага ўзмацненьня і пашырэньня, бо гэта газэта прынясе вялікую карысьць ў будаўніцтве нашай супольнай Бацькаўшчыны. Цьверда верым, што „старадаунай літоускай Пагоні ні разьбіць, ні спыніць, ні стрымаць“.

◆◆◆◆◆◆

ТЭЛЕГРАМЫ:

РИГА, 10. 8. (Эльта). На Рызкай канфэрэнцыі палякі і латышы прабуюць уцягнуць літвіноў у спрэчку ў справе адносін польска-літоўскіх. Літоўскія прэдстаунікі лічуць, што гэтакія справы там ня могуць мець мейсца.

КОЎНА, 10. 8. (Эльта). Рускія распарадзіліся аб мабілізацыі ў тым баку Дзісенскага павету, які застаўся прызнаным за Літвой, а іменна ў вокругу Богіна. Наагул тутка яны трымаюцца, як на ўласнай тэрыторыі, мусіць ня ведаючы аб тым, што ня ўвесь Дзісенкі павет належ да Расеі.

ВАРШАВА, 12. 8. (Эльта). Па саабшчэньню Рэйтэра, Троцкі прыбыў у Беласток, дзе ўчрадзіў свой штаб.

ВІЛЬНЯ, 12. 8. (Эльта). Па данясненьні Віленскага Аддзелу Эльты эвакуацыя Вільні пасуваецца наперад. Пры Віленскай Камэадантуры ёсьць Літоўская почта; кожны дзень даведываецца туды маса людзёў. Функцыянуе таксама і бальшавіцкая почта, аднак лічба даведуючыхся літоўскай почты— большая. Па данясеньні Віленскага Аддзелу Эльты апрыч даных учора да ведама новых газет, у Вільні выдаецца яшчэ адна жыдоўская некамуністычная газэта. Апрыч таго выходзяць газэты „Камуніст“— у літоўскай мове, каторы ня маючы вестак, памяшчае тэлеграмы нашай „Эльты“, часам навет азначаючы імен „Эльта“. „До Валькі“ — ў польскай мове і „Красное знамя“ — ў расейскай. Учора 11 жніўня адчынен у Вільні аддзел Літоўскай Тэлеграфнай Агентуры „Эльта“, які пакуль што мае свае бюро ў Літоўскай Камэндантуры.

ЛЁНДАН, 14. 8. (Эльта). Французкі прэдстаўнік у Лёндане, ў чацлверг 12 жніўня, у Міністэрстве Заграніцных Спраў нотыфікаваў, што Францыя прызнала Урад Врангеля.

Выдавецтва і рэдакцыя: Стол Друку Міністэрства Беларускіх Спрау. Коуна, Вуліца Адама Міцкевіча, 13а.
ДРУКАРНЯ А. БАКА і Х. МАНКЕСА, КОЎНА.